# ЭСТЭТЫКА ВЫХАВАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПЕДАГОГА-АРГАНІЗАТАРА САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Я.Д.Грыгаровіч,** *доктар педагагічных навук, прафесар, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

Сацыякультурная дзейнасць (далей – СКД) педагога-арганізатара вольнага часу, кіраўніка мастацкага калектыву ацэньваецца грамадствам звычайна як з’ява аб’ектыўна станоўчая, сацыяльна значная, таму што работнік культуры з’яўляецца і носьбітам, і стваральнікам найбольш каштоўнасных чалавечых якасцей – гуманнасці, інтэлігентнасці, эстэтычнай дасканаласці. Поспех дзейнасці такога работніка вызначаецца не толькі яго прафесійнымі ведамі і ўменнямі, але і псіхалагічнымі якасцямі, рысамі характару, учынкамі, паводзінамі – яго асобай як сукупнасцю характэрных, толькі яму ўласцівых асаблівасцей паводзін і дзейнасці.

З філасофскага пункту гледжання паняцце “дзейнасць” разглядаецца як спецыфічны спосаб фарміравання адносін да свету, як працэс асваення і творчага пераўтварэння асяроддзя і прыроды. У гэтым сэнсе асоба работніка культуры выступае як суб’ект, а ўсё зробленае – як аб’ект дзейнасці. У працэсе працоўнай дзейнасці асоба, асвойваючы навакольны свет і грамадскія законы, відазмяняе, удасканальвае сябе. Дзейнасць, паводле выказвання А.М.Лявонцьева, “гэта не рэакцыя і не сукупнасць рэакцый, а сістэма, якая мае будову, свае ўнутраныя пераходы і пераўтварэнні, сваё развіццё” [1, с. 137].

Структура любой дзейнасці ўкладаецца ў схему: мэта – матыў – спосаб – вынік. З псіхалагічнага пункту гледжання эстэтычная дзейнасць патрабуе пастаноўкі канкрэтнай мэты, вызначэння асноўных матываў, усведамлення неабходнасці і мэтазгоднасці рэалізацыі пастаўленых задач, умоў, спосабаў і сродкаў яе ажыццяўлення і аналізу атрыманых вынікаў у суадносінах з вызначанымі ў пачатку дзейнасці мэтамі і задачамі. У педагагічнай навуцы дзейнасць разглядаецца як сукупнасць пэўных мэтанакіраваных дзеянняў, рэалізацыя якіх вядзе да эфектыўнага вырашэння пастаўленых выхаваўчых і адукацыйных задач. Структура дзейнасці выяўляецца ў суадносінах мэт, матываў, сродкаў у спалучэнні з атрыманымі вынікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасны аспект чалавечага існавання пакладзены ў аснову структуравання асобы, зробленага М.С.Каганам, які сцвярджае, што асоба набывае сваю структуру з відавой будовы чалавечай дзейнасці і характарызуецца пяццю патэнцыяламі: гнасеалагічным, аксіялагічным, творчым, камунікатыўным і мастацкім. *Гнасеалагічны* патэнцыял вызначаецца аб'ёмам і якасцю інфармацыі, якую мае асоба і якая складаецца з ведаў пра знешні свет (прыродны і сацыяльны) і самапазнання. *Аксіялагічны* патэнцыял вызначаецца сістэмай каштоўнасных арыентацый у маральнай, палітычнай, эстэтычнай сферах, здабытай асобай у працэсе выхавання, гэта значыць ідэаламі, светапоглядам, перакананнямі. *Творчы* патэнцыял вызначаецца атрыманымі асобай і самастойна выпрацаванымі ўменнямі і навыкамі, здольнасцямі да дзеяння і мерай іх рэалізацыі ў дзейнасці. *Камунікатыўны* патэнцыял абумоўліваецца мерай і формамі яе (асобы) таварыскасці, характарам і трываласцю кантактаў, устанаўліваемых з іншымі людзьмі. *Мастацкі* патэнцыял асобы вызначаецца ўзроўнем, зместам і інтэнсіўнасцю яе мастацкіх патрэбнасцей і спосабамі іх задавальнення, абумоўліваецца не сваім характарам, тэмпераментам, фізічнымі якасцямі і г.д., а тым, што і як яна ведае, што і як яна цэніць; што і як яна стварае; з кім і як яна ажыццяўляе зносіны; якія яе мастацкія патрэбнасці і як яна іх задавальняе [2, с. 262]. Гэта значыць, асоба ацэньваецца праз розныя віды яе дзейнасці і адносін з іншымі людзьмі.

Не змяншаючы ролі і значэння мастацкай дзейнасці ў развіцці асобы, трэба адзначыць унутраную таўталогію такой градацыі. Мастацкая дзейнасць нароўні з навуковай ёсць частка творчай, што агульнапрынята ў навуцы і ў грамадскай практыцы. Таму больш дакладна і апраўдана было б уключыць у гэты рад *эстэтычную дзейнасць* як асобую форму ствральнай прадукцыйнай дзейнасці па законах прыгажосці ў розных сферах чалавечага існавання: у быце, навакольным асяроддзі, у прыродзе, працы, чалавечых адносінах, мастацтве і інш.

У філасофска-эстэтычнай літаратуры катэгорыя “эстэтычная дзейнасць” падаецца ў розных аспектах. Мы падзяляем пункт гледжання вучоных, якія прадстаўляюць катэгорыю эстэтычнай дзейнасці як якаснае і змястоўнае адзінства, што выступае адначасова і сферай дзейнасці, і сродкам дасягнення выніку. Такі падыход дае магчымасць уявіць эстэтычную дзейнасць і як характарыстыку прафесійнай адпачынкавай дзейнасці, і як яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўны ўзровень, форму, наяўнасць у ёй эстэтычнага, і адначасова як сферу прыкладання арганізатарскіх здольнасцей і педагагічнага майстэрства. Эстэтычнае вызначаецца суадносінамі рэальнага і ідэальнага: рэальнага жыцця людзей і іх сацыяльнага ідэалу. Такое разуменне эстэтычнага вызначае і адпачынкавую дзейнасць як дыялектычныя суадносіны ўяўляемага ідэалу, выражанага ў прафесійнай творчасці, і рэальных педагагічных магчымасцей асобы.

Уменне ствараць прыгажосць у паўсядзённай працы не прыходзіць да чалавека само па сабе, гэтая здольнасць развіваецца сям'ёй, школай, грамадствам, вучэбна-выхаваўчымі ўстановамі. Для таго каб тварыць "па законах прыгажосці" (К.Маркс), неабходна адчуваць, успрымаць, разумець прыгожае ў навакольным свеце. Ю.П.Азараў называе гэты кампанент асобы "адчуваннем прыгажосці" – здольнасцю прыўнясення ў свой і навакольны свет эстэтычнай культуры [3, с. 39], эстэтычнага перажывання таго, што адбываецца, калі гэтае адчуванне выступае вядучай сутнаснай характарыстыкай прафесійнага боку асобы.

Спецыфіка эстэтычнай дзейнасці як фактар універсальнага дзеяння заключаецца ў эстэтычным характары функцыянавання ўсіх элементаў прафесійнай работы педагога сацыякультурнай дзейнасці. У гэтых функцыях асоба не толькі выяўляецца, але і ўдасканальваецца, развіваецца, актывізуецца. Менавіта актыўнасць як мера дзейнасці педагога-арганізатара СКД ляжыць у аснове мэтанакіраванага і паспяховага эстэтыка-педагагічнага ўздзеяння на ўдзельнікаў аматарскай творчасці, таму што толькі мэтанакіраванае эстэтычнае ўздзеянне здольнае накіраваць эстэтычнае развіццё чалавека, выхаваць яго сенсорную сферу, выклікаць імкненне да эстэтычнага ўдасканалення свету. Актыўнасць пры гэтым з'яўляецца неабходнай умовай засваення студэнтам ужо існуючых эстэтычных каштоўнасцей і стварэння новых, вызначае эмацыянальныя адносіны да сацыякультурнай дзейнасці з мэтай яе глыбокага пазнання і творчага пераўтварэння па законах прыгажосці, развівае эстэтычныя адносіны студэнта да навакольнага свету.

Эстэтычныя адносіны, у сваю чаргу, маюць усеагульны і універсальны характар, з'яўляюцца арганічным кампанентам усякай дзейнасці і выяўляюць сябе як працэс эстэтызацыі ўсіх сфер чалавечага жыцця. Гэты працэс з'яўляецца спецыфічнай характарыстыкай выхаваўчай дзейнасці педагога СКД. У структуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго асобы эстэтычныя адносіны – катэгорыя абагульненая, якая ўключае адпаведныя адносіны да розных прадметаў, з’яў рэчаіснасці, характар і вынікі прафесійнай дзейнасці, учынкі і паводзіны самога выхаваццеля. Яны аб’ядноўваюць эстэтычнае ўспрыманне, пачуцці, меркаванні, густ, эстэтычны ідэал і выяўляюцца ва ўстойлівай цікавасці да работы ў сферы культуры, эстэтычнай здольнасці яе ажыццяўлення ў гарманічнай форме, самасцвярджэнні як эстэтычнай патрэбнасці і імкнення да эстэтычна накіраванага педагагічнага ўзаемадзеяння. Эстэтычнае перажыванне самога працэсу арганізацыі адпачынкавай дзейнасці становіцца мэтай, выклікае актыўна-дзейсныя адносіны да яе, імкненне да дасягнення дасканаласці ў працэсе выхавання асобы. Эстэтычныя адносіны да сацыякультурнай дзейнасці пры пэўных акалічнасцях абумоўліваюць адэкватнасць структуры асобы педагога будове самой адпачынкавай дзейнасці як крыніцы і сродку задавальнення эстэтычнай патрэбнасці.

Эстэтыка-выхаваўчая дзейнасць складаецца з многіх узаемазвязаных элементаў: канструктыўнага, арганізатарскага, камунікатыўнага, гнастычнага, даследчага, інфармацыйнага і інш. Кожнаму з іх адпавядаюць пэўныя педагагічныя функцыі і здольнасці. *Канструктыўны* аспект дзейнасці, уключаючы адбор, кампазіцыю, праектаванне выхаваўчага матэрыялу, з’яўляецца асновай, на якой будуюцца ўсе астатнія кампаненты сістэмы прафесійнай дзейнасці педагога СКД. Адбіраючы патрэбны матэрыял, выхаваццель эстэтычна перапрацоўвае яго ў прымяненні да індывідуальных асаблівасцей выхаванца, з улікам перспектывы развіцця праектуе яго асобу, сістэму ведаў, светапогляд. Тэзіс А.Макаранкі аб перспектыўных лініях у выхаванні, праектаванне “заўтрашняй радасці” адлюстроўваюць эстэтычны ўзровень функцыянавання канструктыўнага элемента дзейнасці выхаваццеля, магчымасць бачання асобнай выхаваўчай функцыі ў агульнай сістэме ідэй, месца сённяшняга мерапрыемства або занятку ў цэласнай сістэме фарміравання асобы ўдзельніка адпачынкавага працэсу.

Рэалізацыя адпачынкавых праектаў на практыцы здзяйсняецца ў працэсе *арганізатарскай* дзейнасці. Арганізатарскі элемент сацыякультурнай дзейнасці ўяўляе бесперапынны ланцуг пастаноўкі і рашэння выхаваўчых задач. Падыход да гэтай дзейнасці як да працэсу вырашэння творчых задач дазваляе не толькі рэалізаваць эстэтычныя патрэбнасці самога арганізатара, але і выявіць эстэтычную сутнасць дзейнасці, бо задача ўжо ў самы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

момант яе пастаноўкі заключае элемент творчасці, таму што яе рашэнню папярэднічае мысленнае мадэліраванне. Эстэтычныя адносіны вызначаюць характар пошукавага працэсу, суправаджаючы кожны этап эмацыянальным перажываннем, эстэтычным пачуццём. Выконваючы задачу "адным розумам", нельга перажыць "ісціну страсцей", як гаварыў К.С.Станіслаўскі. Для таго каб задача набыла дзейсны характар, яна павінна захапіць самога арганізатара, уключыўшы ў яе мадэліраванне і рашэнне жывое эстэтычнае пачуццё.

Пры ўмове ж сінтэзу эмацыянальнага і рацыянальнага ў метадах выхаваўчага ўздзеяння магчыма і паўнавартасная эстэтычная *камунікатыўная* дзейнасць. Зносіны, накіраваныя ў рэчышча эстэтычных перажыванняў, творчы кантакт абодвух бакоў, іх актыўнасць, напоўненая глыбокім зместам, які цікавіць аб'ект, на фоне добразычлівых, паважлівых адносін набываюць эстэтычны аспект.

Найбольш эфектыўнай формай устанаўлення кантакту ў эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці з'яўляюцца зносіны-дыялог, пры якіх педагог адносіцца да ўдзельніка як да асобы, якую ён прымае ва ўсёй сукупнасці чалавечых якасцей. Мастацтва эстэтычна аформленых міжасобасных кантактаў, здольнасць пранікаць у духоўны свет выхаванца, уменне карыстацца ў працэсе зносін эстэтычнымі прыёмамі і сродкамі педагагічных уздзеянняў складаюць пэўны "талент зносін", здольны ператвараць міжасобасныя кантакты ў каштоўнасці эстэтычнага парадку.

Акрамя названых элементаў, у структуру эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці ўваходзяць інфармацыйны, развіццёвы, арыентацыйны, мабілізацыйны, даследчы і іншыя, якія таксама з'яўляюцца функцыянальнымі характарыстыкамі асобы выхаваўцеля.

Азначэнне эстэтычнага як адносін да прыгожага робіць зразумелым значэнне эстэтычнага пераўтварэння рэчаіснасці як працэсу ўнясення ў яе прыгажосці. Эстэтычная дзейнасць – гэта і ёсць дзейнасць, *мэтай* якой з'яўляецца стварэнне прыгажосці, прыгожага ў чалавеку, у адкрыцці прыгожых і ўзвышаных бакоў жыцця, паказе таго, што ляжыць за рацыянальным светам, выяўленні эстэтычных аспектаў рэчаіснасці. Адпачынкавая дзейнасць, ажыццяўляемая на эстэтычным узроўні, вырашае задачу знаёмства выхаванцаў з прыгажосцю свету, з яго цэласнай карцінай ва ўсёй яе гармоніі. Імкненне далучыць выхаванцаў да прыгожага, патрэбнасць у творчым пошуку метадаў і спосабаў гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далучэння, удасканальванне выхаваўчага працэсу эстэтычнымі сродкамі дазваляюць інтэнсіфікаваць развіццё інтэлектуальных, эмацыянальных і валявых якасцей асобы.

Чалавечае спажыванне вызначаецца імкненнем як мага паўней задаволіць патрэбнасці, што прымушае пастаянна паляпшаць прадукты працы і сродкі вытворчасці. Патрабаванне пастаяннага росту якасці, якое складваецца ў практычнай дзейнасці, абагульняецца ў спецыфічную патрэбнасць – патрэбнасць ва ўдасканаленні, максімальнай адпаведнасцю якой з'яўляецца прыгажосць як эстэтычная каштоўнасць.

Патрэбнасць ва ўдасканаленні ў структуры асобы педагога СКД праяўляецца як свядомае стварэнне мэтазгоднай прыгажосці ў працэсе выхаваўчай дзейнасці і з'яўляецца асноўным рэгулятарам паводзін і творчай эстэтычнай актыўнасці, выступае як патрэбнасць у эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці, што становіцца ўмовай яго актыўнага, эмацыянальнага, творчага самавыяўлення праз эстэтычную самаадукацыю, самавыхаванне, удасканальванне выхаваўчых здольнасцей, якія падраздзяляюцца на агульныя і спецыяльныя.

Агульныя выяўляюць такую сістэму інтэлектуальных уласцівасцей асобы, якая забяспечвае адносную лёгкасць і прадукцыйнасць авалодання ведамі аб навакольным свеце. Спецыяльныя здольнасці забяспечваюць пры роўных іншых умовах высокія дасягненні ў пазнанні спецыяльнай галіны дзейнасці.

Акрэсліваецца і трэцяя група – здольнасці да практычнай дзейнасці, якія ўключаюць таксама і педагагічныя здольнасці. Эстэтычныя адносіны да рэчаіснасці ў структуры асобы будучага педагога адпачынкавай дзейнасці вызначаюць эстэтычную накіраванасць фарміравання педагагічных здольнасцей як сінтэзу спецыяльных і агульных. Схільнасць да эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці выклікае патрэбнасць удасканальвання педагагічных здольнасцей да эстэтычнага ўзроўню.

На станаўленне здольнасцей асобы, акрамя прыродных задаткаў, непасрэдна ўплываюць культура, асяроддзе, сацыяльны вопыт, спецыяльная адукацыя, мастацтва. Але іх развіццё вызначаецца не наяўнасцю самой культуры, а спосабам спасціжэння духоўных скарбаў, дзейнасцю асобы па засваенні вынікаў функцыянавання культуры. У залежнасці ад характару засваення чалавек можа развівацца або ў рамках тых дасягненняў, якія зафіксаваны ў агульным фондзе культурных каштоўнасцей, або выпрацоўвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новыя. У нашым выпадку – гэта эстэтыка-выхаваўчыя здольнасці як прафесійная творчасць педагога СКД, пры якой прадукт педагагічнай дзейнасці афарбаваны індывідуальнымі асаблівасцямі яго асобы. У гэтым і заключаецца спецыфіка сістэмы “педагог – выхаванцы”.

У сувязі з азначанай спецыфікай эстэтычныя здольнасці педагога, выступаючы як стымулятар эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці, у той жа час становўча праяўляюцца і ў іншых галінах дзейнасці, удасканальваючы і развіваючы іх. Так, многія кампаненты эстэтычных прафесійных здольнасцей выхавацеля (успрыманне і ацэнка, эмацыянальная чуласць, педагагічнае ўяўленне, асацыятыўнасць творчага педагагічнага мыслення) не складаюць абсалютна ізаляванай сферы, а важныя для многіх іншых відаў дзейнасці выхавацеля як асобы. Значыць, здольнасці да эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці ў структуры асобы педагога-арганізатара могуць развівацца і за межамі гэтай дзейнасці. На пярэдні план выступае асобасны механізм рэгуляцыі дзейнасці – ацэнка, але ацэнка не адпаведнасці гатовых спосабаў дзеяння ўмовам, а сваіх магчымасцей канкрэтным патрабаванням (пачынаючы з псіхічных уласцівасцей і заканчваючы прафесійнымі ўменнямі). Пры гэтым псіхалагічнымі перадумовамі фарміравання эстэтычных здольнасцей, а значыць, і перадумовамі эстэтычна накіраванай практычнай эстэтыка-выхаваўчай дзейнасці з’яўляюцца асобасныя ўласцівасці будучага выхавацеля, як і структура яго ведаў, матываў, стымулаў, устойлівых узаемазвязаных мэт і ацэнак.

---

1. *Леонтьев, А.Н.* Очерк развития психики / А.Н.Леонтьев // Избранные психологические произведения: в 2 т. – М.: Педагогика, 1983. – Т. 2.

2. *Каган, М.С.* Человеческая деятельность (опыт системного анализа) / М.С.Каган. – М.: Политиздат, 1984.

3. *Азаров, Ю.П.* Педагогика любви и свободы / Ю.П.Азаров. – М.: Тоника, 1994.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ